# Дадзены старт другому конкурсу інавацыйных праектаў «Еўразійскія лічбавыя платформы»

Еўразійская эканамічная камісія абвясціла аб пачатку другога штогадовага конкурсу інавацыйных праектаў «Еўразійскія лічбавыя платформы», які заклікаы выявіць кампаніі і праекты, здольныя ўнесці значны ўклад у рэалізацыю лічбавага парадку Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС).

У 2019 года ў конкурсе змогуць прыняць удзел інавацыйныя праекты ў наступных галінах:

- прамысловасць,
- сельская гаспадарка
- гандаль.

Асноўныя мерапрыемствы ў рамках конкурсу будуць праходзіць на вядучых дзелавых пляцоўках у пяці дзяржавах - членах ЕАЭС: Рэспубліка Арменія, Рэспубліка Беларусь, Рэспубліка Казахстан, Кыргызская Рэспубліка, Расійская Федэрацыя.

Фінал конкурсу і ўзнагароджанне яго пераможцаў адбудзецца ў верасні 2019 года ў рамках міжнароднага форуму «Еўразійскі тыдзень - 2019» (Кыргызская Рэспубліка).

Журы абярэ трох пераможцаў конкурсу. Яшчэ два праекты маюць магчымасць атрымаць прыз сімпатый Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Пераможцы конкурсу атрымаюць:

- грашовыя гранты на рэалізацыю сваіх праектаў і льготныя ўмовы ўдзелу ў акселерацыйных праграмах ад партнёраў конкурсу,
- магчымасць прадставіць свае праекты патэнцыйным інвестарам, акселератарам, венчурным фондам і прадстаўнікам дзяржаўных устаноў на галоўным форуме дзяржаў - членаў ЕАЭС і ў ходзе сустрэч з прадстаўнікамі Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Для падачы заяўкі трэба запоўніць онлайн-анкету на сайце конкурсу http://contest.eaeunion.org/

Крыніца:
http://contest.eaeunion.org

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/22-03-2019-4250*